

З Евангелля св. Мацвея

Прыйшоў Езус ў самарыйскі горад, званы Сіхар, блізка да надзелу зямлі, які даў Якуб сыну свайму Юзафу. Была там студня Якуба. Езус жа, стомлены дарогай, сеў пры студні. Было каля шостай гадзіны. Вось прыходзіць жанчына з Самарыі зачарпнуць вады. Езус кажа ёй: “Дай Мне піць”. Вучні ж Ягоныя адышлі ў горад купіць ежы. Жанчына самаранка кажа Яму: “Як Ты, юдэй, просіш піць у мяне, самаранкі?”. (Бо юдэі не маюць зносін з самаранамі.) Езус сказаў ёй у адказ: “Калі б ты ведала дар Божы і хто кажа табе «дай мне піць», то сама прасіла б у Яго, і Ён бы даў табе жывой вады”. Жанчына кажа Яму: “Пане, у цябе і зачарпнуць няма чым, а студня глыбокая; адкуль жа ў Цябе вада жывая? Няўжо ты большы ад айца вашага Якуба, які даў нам гэтую студню і сам з яе піў, і дзеці яго, і статкі яго?”. Езус сказаў ёй у адказ: “Кожны, хто п’е гэтую ваду, зноў запрагне, а хто будзе піць ваду, якую Я дам яму, не запрагне навекі, але вада, якую дам яму, стане ў ім крыніцай вады, якая цячэ ў жыццё вечнае”. Жанчына кажа Яму: “Дай мне гэтай вады, каб я не мела больш прагі і не прыходзіла сюды чэрпаць. Пане, я бачу, што Ты прарок. Бацькі нашыя пакланяліся на гэтай гары, а вы кажаце, што месца, дзе трэба пакланяцца, у Ерузалеме”. Езус кажа ёй: “Павер мне, жанчына, што надыходзіць час, калі ні на гэтай гары, ні ў Ерузалеме будзеце пакланяцца Айцу. Вы пакланяецеся таму, чаго не ведаеце. Мы пакланяемся таму, што ведаем, бо збаўленне – ад юдэяў. Але надыходзіць час, і цяпер ўжо ёсць, калі праўдзівыя вызнаўцы будуць пакланяцца Айцу ў Духу і праўдзе. І такіх вызнаўцаў шукае сабе Айцец. Бог ёсць Духам, і тыя, хто пакланяецца Яму, павінны пакланяцца ў Духу і праўдзе”. Жанчына кажа Яму: “Я ведаю, што прыйдзе Месія, які завецца Хрыстом. Калі Ён прыйдзе, абвесціць нам усё”. Езус кажа ёй: “Гэта Я, які гавару з табою”. Шмат самаранаў з горада гэтага паверыла ў Яго дзякуючы слову жанчыны, якая сведчыла, кажучы: “Расказаў мне ўсё, што я рабіла”. Таму, калі прыйшлі да Яго самаране, прасілі Яго застацца з імі. І Ён заставаўся там два дні. І яшчэ больш людзей паверыла дзякуючы слову Ягонаму. А жанчыне казалі: “Мы верым ўжо не дзеля твайго апавядання, бо мы самі пачулі і ведаем, што Ён сапраўды Збаўца свету”. †

Ян 4, 5-15. 19b-26. 39a. 40–42

Крыніца жывой вады

Сустрэча і размова Езуса з самаранкай паказваюць, што кожная асоба мае біялагічныя патрэбы. Адной з самых асноўных з’яўляецца задавальненне смагі. Патрабуючы шукае крыніцу, каб наталіць прагненне, таму што без вады ён можа памерці.

Аднак апроч біялагічных патрэб існуюць і духоўныя. Езус з’яўляецца Крыніцай жывой вады, якая ўказвае мэту людскога існавання і напаўняе жыццё чалавека сэнсам. Таму

самаранка просіць Хрыста аб жывой вадзе, якой з’яўляецца Яго навука, бо разумее, што без яе душа можа загінуць. „Таму, калі прыйшлі да Яго самаране, прасілі Яго застацца з імі”. Гэта не дзіўна. Хто, пазнаўшы сапраўдную Крыніцу жыцця, захоча яе пакінуць? Аднак, на жаль, можа здарыцца рознае. Таму давайце верна трываць пры гэтай Крыніцы – Хрысце. У моманты засухі ў нашым жыцці яна найбольш эфектыўная, здольная наталіць нават самую моцную смагу – душэўную.